№ 177 (299)

Аўторак, 7 кастрычніка 1997 г.

Выдаецца
на беларускай і рускай мовах
Перыядычнасць — 5 разоў
у тыдзень


Выдавец — ТАА "Народная воля"

Кошт: у кіёсках і крамах — 2000 руб., у індывідуальных гандляроў — свабодны.

Народная Воля

На прастор, на шырокі разлог
Выхадзі, мой народ, грамадою...

Якуб Колас



Сонца

	Усход	Заход
Віцебск	7.12	18.22
Магілёў	7.10	18.23
Гомель	7.06	18.21
Мінск	7.21	18.34
Гродна	7.36	18.49
Брэст	7.35	18.51

Першая квадра 9 кастрычніка

Пейджинговую связь редакции обеспечивает компания
МОБИЛКОМ пейджинг-система
(017) 222-46-51
(017) 222-46-52

Дипкурьер

Валентин Аголец меняет мундир генерала на фрак дипломата?

В дипломатическом ведомстве Республики Беларусь произошли два изменения, которые "Народная воля" предсказывала еще два месяца тому назад. Президент Александр Лукашенко подписал указы о назначении Николая Бузо заместителем министра иностранных дел и о переводе зам.министра Михаила Хвостова на должность Чрезвычайного и Полномочного посла Беларуси в Канаду.

Сделав два точных "попадания", рискнем сделать еще одно предположение. По имеющимся у нас данным, готовится сменить мундир генерала на фрак дипломата нынешний министр внутренних дел Валентин Аголец. Главе внешнеполитического ведомства Ивану Антоновичу предписано в течение месяца подыскать для генерала работу за рубежом.

Владимир ГЛОД.

Што там, на палетках?

Дзе дбаюць, там і маюць

"У природы нет плохой погоды". Гэта даволі папулярная песня міжволі ўспомнілася, калі я знаёміўся з ходам бульбаўборачных работ.

Па стану на мінулую пятніцу ў краіне ўбрана 64 працэнты бульбяных палеткаў. Сярэдняя ўраджайнасць складае 109 цэнтнераў з гектара. Малавата. Для параўнання заўважу, што ў 1993 годзе на канец верасня была выкапана амаль палова палеткаў і ўраджайнасць тады была 162 цэнтнеры з гектара. Летась было атрымана з кожнага гектара па 150 цэнтнераў клубняў. Як бачым, бульбы атрымоўваем у паўтара раза меней.

Чаму? Многія сцвярджаюць, што, маўляў, год выдаўся неспрыяльны. Мабыць, і так. Але чаму ж тады некаторыя гаспадаркі дабіліся проста выдатных вынікаў? Так, у сельскагаспадарчым кааператыўным прадпрыемстве "Кастрычнік" Гродзенскага раёна, калгасе імя Прытыцкага Бераставіцкага раёна маюць амаль пад трыста цэнтнераў з гектара, а ў гаспадарцы "Прагрэс" Гродзенскага і калгасе "Новы свет" Капыльскага раёна — болей за 250 цэнтнераў з гектара. У цэлым у Гродзенскім раёне сабралі амаль па 200 цэнтнераў клубняў з гектара, у Бераставіцкім — дзесьці 180 цэнтнераў, у Кобрынскім — за 160 цэнтнераў...

Вось вам і неспрыяльны год. Стала быць, справа не ў надвор'і, а ў гаспадарлівых адносінах да зямлі і ўраджаю. Там, дзе дбаюць, там і маюць. Пры любым надвор'і. Праўда, адсюль вынікае даволі несуцяшальны вывад. Выходзіць, што пераважная большасць працуючых на зямлі не з'яўляюцца руплівымі гаспадарамі?

Алесь ДРАБЧУК.

Судите сами

Чиновников – все больше, жить – все хуже

Видный российский экономист и публицист, профессор Отто Лацис как-то сказал: "Нет больше в мире стран, которые были бы так глупо устроены. Мы не бедно живем, мы живем глупо". И хотя эти слова известного журналиста, почему-то недруга нынешних белорусских властей, относились к бывшему СССР, они применительны к сегодняшней нашей реальности. Недавно мне попались на глаза просто шокирующие сведения. Они настолько удивительные, что пришлось их занести в свою записную книжку. Впрочем, читатели "Народной воли" смогут в этом убедиться, когда познакомятся с небольшой табличкой.

Государства	Количество действующих		Доля частного сектора в производстве валового внутреннего продукта, в процентах
	Министерства	Госкомитеты	
Республика Беларусь	27	35	15
Российская Федерация	21	17	60
США	11	6	90

Вот, оказывается, где маленькая Беларусь впереди планеты всей. Перещеголяв, получается, не только своего главного союзника на Востоке, но и заокеанскую сверхдержаву по числу управленцев. Поневоле хочется спросить белорусского президента: где ваши предвыборные обещания о сокращении на 30 процентов административно-управленческого аппарата? Почему уже при вас, уважаемый Александр Григорьевич, число государственных служащих в органах власти в столице и на местах увеличилось, по данным профсоюзов, на 8300 человек, из которых 800 — на республиканском уровне. Всем им вовремя подай весьма значительную зарплату, которая, кстати, превышает уровень среднемесячной зарплаты по стране уже на 43 процента и периодически повышается. В это же время жизненный уровень большинства населения неуклонно падает. Да, впрочем, по-другому и быть не может, если учесть, что наша маленькая, беднейшая европейская страна помимо министерств и ведомств содержит еще десятки всевозможных концернов, управлений, объединений, целых шесть областей с многочисленным аппаратом чиновников, не говоря уже о районных центрах.

Добавим сюда 125 тысяч человек в милицейской форме (в соседней Польше при 40 миллионах населения в полиции только 80 тысяч человек!), 85-тысячную армию да еще всесильный КГБ. Я уже не говорю о растущем аппарате службы безопасности президента. Но при этом колхозники имеют 10—20 долларов зарплаты, а страна в целом — огромный внешний долг.

Долгие годы нас держали в неведении относительно сущности экономических законов, ситуации в мире, а власти отмахивались от мирового опыта законов управления. Пожалуй, и нынешняя команда Лукашенко — Прокоповича снова идет своим особенным путем в никуда. Что толку, что усилившееся вмешательство государственной машины во все сферы жизни, тотальный контроль над всеми и вся не приносят результатов?! Не удивляет уже, что даже россияне начинают жить получше нас, имея в 2—3 раза большую зарплату. Они свободно могут купить те же минские холодильники или витебские телевизоры по ценам, существенно ниже белорусских. В Америке же уровень минимальной **ежедневной** зарплаты достиг 45 долларов, простой рабочий имеет там в неделю больше 500 долларов. Для полной картины не хватает, пожалуй, описания ситуации в соседних с нами балтийских странах, Польше, где жизнь, хоть и медленно, но понемногу налаживается. Ведь повсюду отказались от отживших административно-командных методов управления, на что никак не решаются белорусские власти со своим громоздким, разбухшим госаппаратом.

Владимир ШИК.

г.Поставы.

Новости столицы



На новом участке метро второй линии Минского метрополитена от станции "Тракторный завод" до станции "Автозаводская" на минувшей неделе состоялся пуск пробного поезда. Этот участок планируется сдать в эксплуатацию в начале ноября.

На снимках: *пробный электропоезд; новая станция Минского метро — "Автозаводская".*

Фото Виктора ТОЛОЧКО, БелТА.

Творчасць чытачоў

Генадзь АЎЛАСЕНКА

Срэбны коннік

Герб "Пагоня"...
Знак надзеі —
ад сівых-сівых вякоў...
Срэбны коннік,
Срэбны меч
І чырвань, чырвань навакол.

Герб "Пагоня"...
У бяздонні
чалавечае бяды
Срэбны коннік...
Ну куды,
куды імчыш ты
праз гады?!

Праз стагоддзі...
Праз нягоды,
непагоды
і агні...
Можа, годзе?
Можа, хопіць?
Прыпыніся! Адпачні!
Але дзе там...
Б'юць падковы,
падмінаючы мурог...
Сцяты зубы...
Не збярог цябе,
край любы,
не збярог!
Каля хатаў роднай мовы,
родных песень
не чуваць...

Вінаваты...
Як магу я
ў гэткі час
адпачываць!

Сцяты зубы,
Пад шаломам
вочы полымем гараць...
Край мой любы!
Я не дам табе,
край родны,
паміраць!

Герб "Пагоня"...
Гэта — продкі,
нашы продкі,
крывічы...

Срэбны коннік,
Грукачы ты ў нашы душы, грукачы!
Срэбны коннік,
Нібы ў дзверы,
Бі ты ў грудзі нашы, бі!
Дай нам веру!
Ад бязвер'я
Край наш родны барані!

г.Чэрвень.

Розничные цены на автозаправках г.Минска

(на 03.10.1997г.)

Фирма	Валюта/ед.изм.	Цены в бел.руб.					Опл.
		А-76	АИ-92	АИ-95	АИ-98	Диз.топ.	
Минскавтозаправка							
для бюджетн. орг-ций	BYB/л	5.600	6.100	—	—	4.100	б/р
договорные	BYB/л	7.300	9.500	11.500	14.000	6.100	н/р; б/р
ЛУКойл	BYB/л	7.300	9.400	12.500	—	6.100	
Бикаран	BYB/л	7.300	9.700	12.500	—	6.200	н/р
Экоцвет	BYB/л	7.300	10.000	12.400	14.700	6.300	н/р
Милком	BYB/л	7.400	9.800	12.500	—	6.300	н/р; б/р
ФКВП	BYB/л	7.500	9.500	12.500	—	6.500	н/р
Нэсте	BYB/л	7.700	10.200	12.700	15.100	6.700	н/р; б/р
Лаффает	BYB/л	7.600	9.600	—	—	6.200	б/р

За кратамі

Шыдлоўскі ў другі раз за месяц аб'явіў галадоўку. Лабковіч чакае, калі сядзе за парту, а не ў турму

Маці зняволенага ў Стоўбцах 16-гадовага Вадзіма Лабковіча напярэдадні гэтай паездкі сказала, што яе сына, які прапускае школу, выпусцяць пад падпіску альбо закрыюць справу ўвогуле. Вадзім — наймалодшы сёння палітвязень. Яму разам з 19-гадовым Алесем Шыдлоўскім інкрымінуюцца два страшэнныя артыкулы Крымінальнага кодэкса за распісаныя нацыяналістычнымі лозунгамі Стоўбцы.

У кампаніі адваката і намесніка старшыні БНФ Алеся Бяляцкага едзем на машыне — забіраць хлопца. У Стоўбцах халодна. На сцяне пракуратуры — мемарыяльная дошка. Супраць будынка міліцыі — могілкі. Гэта наводзіць на пэўныя асацыяцыі. Мясцовыя жыхары, аднак, пра "палітвязняў" не чулі, затое абакралі "ментоўку" — на трыста бланкаў пасведчанняў кіроўцы.

Газету ў перадачу не прынялі — па ўсіх Стоўбцах адрубаюць электрычнасць, а хлопцы сядзяць без акенца. У паўцемры. Старэйшы Шыдлоўскі хворы на астму, пасправаваў быў у следчым ізалятары ў Жодзіне абвясціць галадоўку. Але быў моцна збіты і ўвесь час адляжаў у шпіталі.

Хлопцы са следчай брыгады з "пранізваючым поглядам" (мусіць, тыя самыя, якія з самага ранку выклікалі жонку Шыдлоўскага ў Мінск, у КДБ, — ужо чацвёрты раз) вывучаюць нас. Маці "вязня" нервова пасміхваецца на змрочныя жарты — у сутыкненні з сістэмай "усеагульнага" жаху ўсё становіцца ірэальным.

Адвакат вяртаецца — вельмі стомлены, але падбадзёрвае: "Паслязаўтра мусім забраць хлопца". Маці разгубленая, але за гэты месяц прызвычаілася ўжо да ўсяго, трывае. Вяртаемся назад ні з кім і ні з чым.

Чыстае з раніцы неба, зацягнутае неверагодна прыгожымі верасьнёўскімі хмарамі. "Я варона, я варона", — спявае надрывіста Лінда ў дынаміках. Чатыры дарослыя чалавекі — едзем моўчкі, маці ў вочы лепш не глядзець. Ці то сорамна, ці то страшна.

Гэта было ў дзень, калі затрыманых абяцалі выпусціць. А на наступны хлопцаў зноў адвезлі ў Жодзіна. Справай, па нашых звестках, заняўся сам Генпракурор. Шыдлоўскі зноў абвясціў галадоўку, як яго з гэтым прынялі ў Жодзіне — пакуль невядома. Ці ж вызваляць школяра Вадзіма Лабковіча? І калі? Хлопцу ж вучыцца трэба, адукацыю атрымоўваць. Ці падумаў хто аб гэтым, запісваючы яго ў злачынцы?

Міхась ШУПЕНЬКА.

Обсудим!

Начинающие политики занимают место за "круглым столом". "Тройками"...

Белорусская ассоциация молодых политиков продолжает работу постоянно действующего "круглого стола" "Мир глазами молодых". Как известно, подобные мероприятия проводились и ранее.

"Круглый стол" на тему "Осень-97 — политический перекресток" состоится 12 октября в 14.00 по адресу: г.Минск, ул.К.Маркса, 40. Количество участников от организации — до трех человек.

А.ЦЫНКЕВИЧ, исполнительный директор Белорусской ассоциации молодых политиков.

Стоп-кадр



Асеннія кветкі...

Фота Міхаіла СЕМЧАНКІ.

А што на Міншчыне?

Цяпло нам толькі сніцца

З трывогай чакаюць набліжэнне халадоў многія жыхары Вілейкі, асабліва тыя, якія жывуць у дамах з цэнтралізаваным ацяпленнем. Справа ў тым, што ў леташнюю адносна цёплую зіму не надта цёпла было ў іх кватэрах, а гарачая вада падавалася толькі па суботах і крыху па нядзелях, па прычыне невялікіх тэмператур мёрзлі дзеці ў школах і навучэнцы прафтэхвучылішчаў райцэнтра. Прычына цяжкасцяў у недахопе сродкаў для закупу паліва, якіх у мясцовым бюджэце не хапае, бо не надта ўтульна сябе адчувае буйнейшы падаткаплацельшчык раёна — завод "Зеніт".

Калі ў магазінах дорага, купім на кірмашы

Традыцыйная для краіны асенняя ярмарка па продажы сельскагаспадарчай і іншай прадукцыі праходзіла на працягу першых двух выхадных дзён кастрычніка і на цэнтральнай плошчы Маладзечна. Асаблівым попытам карысталіся бульба, гародніна, іншыя прадукты, неабходныя для зімы. Іх можна было купіць прама з машын, толькі ва ўмовах сённяшніх эканамічных адносін зрабіць гэта ўсё цяжэй. За мех любімай усімі бульбачкі трэба зараз аддаць не менш за 250 тысяч рублёў, а каб больш-менш прыстойна пражыць зіму, неабходна выкласці ўжо мільён, што далёка не кожнаму сёння па кішэні.

Уладзімір ШЫК.

Запрашаем на вечарыну

Пімен Панчанка заўсёды з намі

8 кастрычніка ў вялікай зале Дома літаратара адбудзецца вечарына, прысвечаная 80-ым угодкам нараджэння народнага паэта Беларусі Пімена Панчанкі "Заўсёды і ўсюды ў сэрцы маім малітва адна — Айчына". Дом літаратара запрашае ў гэты дзень усіх прыхільнікаў творчасці вялікага майстра беларускай паэзіі.

Ганна ЗАЙЦАВА.

Слышали?

Молодые консерваторы Европы выступили в защиту представителей "Молодого фронта"

Прибывшие в Минск представители международной молодежной организации "European young conservatives" ("Молодые консерваторы Европы") провели в штабквартире БНФ пресс-конференцию, в ходе которой поведали о встречах с молодежью Беларуси, поделились своим видением проблем политической и экономической ситуации в Беларуси, и особенно были поражены отсутствием свободы и основных прав человека в стране, которая стремится считать себя европейской. По их мнению, Беларусь оказалась сама собой изолированной от европейского и мирового сообщества.

Участников конференции зарубежные гости ознакомили с содержанием направленного президенту Республики Беларусь письма. Есть в нем такие строки:

"Мы особенно озабочены арестом двух человек из "Молодого фронта", который является членом Европейского союза молодых консерваторов. Они были арестованы в подозрении написания антиправительственной надписи. И до сих пор им не предъявлено обвинение. Им было отказано в доступе к законному протесту. И даже членам их семей было запрещено видеться с ними.

Мы особенно озабочены состоянием их здоровья, особенно после того, как они объявили голодовку в течение нескольких недель.

Мы требуем их освобождения на основании гуманизма".

Витольд БОРОВИЦКИЙ.

Пригласительный билет

Немецких музыкантов можно послушать и в Минске...

Посольство Федеративной Республики Германия в Республике Беларусь сообщает, что 8 октября в 19.00 в концертном зале Минской филармонии состоится концерт камерного оркестра университета г.Карлсруэ. Этот оркестр является одним из известнейших музыкальных коллективов высших учебных заведений Германии. Он был основан его руководителем Дитером Кёнляйном в 1976 году. В первые годы в его программе в основном стояли произведения эпохи барокко, а также классической музыки. Позже оркестр стал больше интересоваться интерпретацией романтической и современной музыки. Он трижды (в 1985, 1992 и 1996 годах) получал призы на конкурсах музыкальных оркестров Германского музыкального совета и много раз бывал на гастролях в различных странах мира.

В программе концерта, который состоится в Минске, следующие произведения: Л.ван Бетховена (симфония №1 до мажор), Д.Шостаковича (концерт №1 до минор для фортепиано с оркестром), А.Дворжака (серенада ми мажор).

Гастрольная поездка камерного оркестра университета г.Карлсруэ в Минск осуществляется при финансовой поддержке Министерства иностранных дел Германии. Она стала возможной благодаря установленным контактам с фольклорным ансамблем "Ведрица" из Минска, который в июне этого года принимал участие в европейском фестивале фольклорных ансамблей в г.Карлсруэ.

Позвольте не согласиться...

Неправомерными действиями властей Павел Шеремет лишен защитника – известного юриста Михаила Волчека

Приказом №120 министра юстиции Республики Беларусь Г.Н.Воронцова приостановлено действие лицензии на право занятия адвокатской деятельностью Михаилу Волчеку, осуществлявшему защиту Павла Шеремета, обвиняемого в умышленном незаконном пересечении государственной границы Республики Беларусь.

Основанием для принятия такого решения, как указано в приказе министра юстиции, явилось то обстоятельство, что в августе 1997 года в газете "Фемида-Нова" была дана информация об адвокате М.В.Волчеке, у которого "гражданские дела практически все выиграны, велик процент выигранных уголовных дел, т.е. допущена реклама деятельности адвоката Волчека". В этом же приказе также отмечено, что в сентябре 1997 года в указанной газете помещена статья М.В.Волчека "Может ли президент помиловать Шеремета?", в которой "до начала судебного процесса он усомнился в действенности судебной системы республики, бросил тень на работников КГБ и прокуратуры, расследовавших уголовное дело, допустил нетактичные выражения в адрес главы государства".

Анализ фактических обстоятельств, а также действующего законодательства, регулирующего деятельность адвокатуры, позволяют сделать следующие выводы.

1. Адвокат Гарри Погоняйло, который как защитник первоначально один вел дело Павла Шеремета, неоднократно необоснованно обвинялся властями в политиканстве и ангажированности, а также в том, что его выступления в печати носят предвзятый характер. Чтобы усилить "линию защиты", исключить подобного рода инсинуации, родители Павла Шеремета привлекли к делу еще одного защитника, которого трудно обвинить в нелояльности и предубежденности. Им стал весьма авторитетный и известный в республике юрист Михаил Волчек, член Минской областной коллегии адвокатов. В газете "Фемида-Нова" (№17 от 29 августа — 4 сентября 1997 года) для читателей газеты дана информация о трудовом пути М.В.Волчека и помещена его фотография. Считать это сообщение "рекламой" также абсурдно, как и обвинение Павла Шеремета в незаконном пересечении государственной границы. Редакцией газеты была дана краткая информация о Михаиле Волчеке — новом защитнике Павла Шеремета по делу, представляющему огромный общественный интерес.

2. В статье "Может ли президент помиловать Шеремета?" Михаилом Волчеком был сделан анализ законодательства о порядке помилования осужденных судами Республики Беларусь граждан. Статья весьма актуальна и своевременна, хотя и носит полемический характер. Упоминание в статье о невозможности помилования президентом Республики Беларусь невиновного Павла Шеремета, а также мнение о том, действенна ли правовая система Республики Беларусь при допускаемых ею сегодня грубых нарушениях законности, является не нарушением адвокатской этики, а выражением гражданской позиции Михаила Волчека, обличающего всякого, кто нарушает права и свободы граждан, их законные интересы. Это в полной мере соответствует требованиям статьи 18 Закона Республики Беларусь "Об адвокатуре", в которой записано, что адвокат должен постоянно поддерживать престиж своей профессии в качестве участника осуществления правосудия и общественного деятеля.

3. Действующим законодательством (в частности, Законом Республики Беларусь "Об адвокатуре") **не предусмотрено приостановление действия лицензии на занятие адвокатской деятельностью как меры дисциплинарного воздействия.** Незаконность данного приказа министра юстиции подтверждается и анализом норм Уголовно-процессуального кодекса Республики Беларусь. Так, в соответствии со статьей 49 УПК в качестве защитника в деле могут участвовать члены коллегии адвокатов, которые получили в установленном порядке лицензию. Лицензия Михаила Волчека на занятие адвокатской деятельностью не аннулирована в установленном законом порядке. Своими неправомерными действиями министр юстиции Республики Беларусь фактически противодействует оказанию правовой помощи гражданам, что запрещено Конституцией.

В пункте 32 Положения о Квалификационной комиссии по вопросам адвокатской деятельности, на который имеется ссылка в приказе №120 от 25 сентября 1997 года, министр юстиции Республики Беларусь вправе приостановить выдачу или действие лицензии на право занятия адвокатской деятельностью в случае установления обстоятельств, указывающих на несоответствие решения Квалификационной комиссии фактическим обстоятельствам дела, нарушение действующего законодательства, норм профессиональной этики адвокатов или иных данных, свидетельствующих о невозможности заниматься адвокатской деятельностью. В случае установления указанных обстоятельств министр юстиции вправе отказать в выдаче лицензии или выдать ее, а равно возобновить ее действие после сдачи заинтересованным лицом повторного экзамена Квалификационной комиссии. Как видно из анализа пункта 32 данного Положения, приостановление выдачи лицензии или приостановление действия уже выданной лицензии возможно только в случаях несоответствия решения Квалификационной комиссии фактическим обстоятельствам дела. Лицензия Михаилу Волчеку была выдана 9 июля 1997 года на законных основаниях, и это никем не оспаривается. Поэтому ссылка в приказе №120 от 25 сентября 1997 года на эту правовую норму несостоятельна.

Общий вывод:

Приказ №120 министра юстиции Республики Беларусь от 25 сентября 1997 года о приостановлении действия лицензии на право занятия адвокатской деятельностью адвокату Минской областной коллегии адвокатов Михаилу Волчеку является незаконным и необоснованным, подлежащим отмене компетентными органами. В отношении адвоката Михаила Волчека принято **политическое,** а не правовое решение. Это не делает чести Министерству юстиции Республики Беларусь, которое призвано в своей деятельности руководствоваться только законом, должно отстаивать и претворять в жизнь принципы демократического правового государства, к построению которого мы стремимся.

Валерий ТИХИНЯ, президент Белорусского фонда правового сотрудничества, доктор юридических наук, профессор, заслуженный юрист Республики Беларусь.

Кропка над "і"

Не трэба лезці ў чужы манастыр са сваім статутам

Адказ спадару Уладзіміру Вярнігораву, члену суполкі за свабодны выбар мовы навучання, на яго пытанне "Как это надо понимать?" ("Народная воля", №139)

Як бачна з рэдакцыйнай прадмовы, нехта Уладзімір Вярнігораў літаральна згвалціў газету — ён пралез на старонкі папулярнага выдання з пустым артыкулам, у якім, акрамя звычайнай дэмагогіі, нічога няма. Аўтар, бачыце, са здзекам падкрэслівае тое, што Сяргей Навумчык свой матэрыял "Как они продавали страну" напісаў па-руску. Дык зрабіў ён гэта невыпадкова — каб прачыталі і такія, як Вярнігораў, іншыя заступнікі "великого и могучего русского языка".

Што і казаць, нямала ў нас тых, хто не любіць беларускай мовы, хто перашкаджае ёй вярнуцца назад да народа, хто з дапамогаю вось такіх "дэмакратычных" хітрыкаў, як суполка за свабодны выбар мовы навучання, уводзіць людзей у зман.

Пад выглядам быццам бы свабоднага выбару беларуса надакучліва падштурхоўваюць да выбару менавіта расійскай мовы навучання і як бы падказваюць: "Навошта табе, дурненькі, вяртацца назад да сваёй мовы, калі ты ўжо пачаў яе забываць і карыстаешся расійскай моваю. Ты ўжо наш — рускі, і на гэтай падставе мы хутчэй аб'яднаемся ў агульную дзяржаву". Як гаворыцца, "Кось-кось — і ў аглоблі", а потым будзе "Ну!". Такая палітыка абапіраецца на нізкія пачуцці чалавека, на яго ляноту. На тое, што ён нават любіць сваю Радзіму ўжо лянуецца, бо ў душы сваёй здрадзіў ёй і прадаў. Вяртанне назад лічыцца нібы прызнаннем гэтай здрады, і яму сорамна пагадзіцца з гэтым адкрыта. І ён гаворыць: "Какая разница, на каком языке говорить, лишь бы жилось хорошо". Аднак выбар мовы — не толькі права, але і абавязак. Для сапраўднага патрыёта абавязак павінен пераважыць, і ён выбера беларускую мову. А зараз, паважаны спадар У.Вярнігораў, уявіце сабе, што размова ідзе не пра Беларусь, а, напрыклад, пра Англію, куды вы пераехалі на пастаяннае жыхарства і дзе захацелі стварыць такую ж суполку, каб ангельцы пераходзілі на расійскую мову навучання. Думаю, што ангельцы вас не зразумелі б, бо гэта была б скрытая форма ўнутранай акупацыі чужой краіны. Вы забылі нядрэнную рускую прыказку: "В чужой монастырь со своим уставом не суйся". Але імкнецеся ў беларускі манастыр са сваім, расійскім, статутам, хочаце, каб на яго перайшлі беларусы і адмовіліся ад свайго. Правільна сказаў З.Пазьняк, што на Беларусі зараз усталявалася ўнутраная расійская акупацыя і вашы дзеянні і тое, што кажаце, — гэта яе праява.

У вашым адкрытым лісце многа недарэчнасцей гістарычнага плана. Называеце беларускі і расійскі народы братэрскімі, але як гэта параўнаць з тым, што на працягу болей за 300 гадоў Масковія вяла жорсткія захопніцкія войны з Літвою, галоўнай часткай якой была сучасная Беларусь. У выніку вайны 1654—1667 гадоў насельніцтва нашай краіны зменшылася на 52% (больш чым удвая). Сапраўдныя браты адзін аднаго не знішчаюць. Нашыя народы трэба называць не братэрскімі, а суседскімі сваякамі і не болей. Яны родныя, але больш далёкія, чым братэрскія, як, напрыклад, стрыечныя або траюрадныя браты. Але зараз сярод расіян знаходзяцца людзі, якія лічаць беларусаў, рускіх і ўкраінцаў нават адной нацыяй. Гэта не так: шавіністы сваё пажаданне выдаюць за сапраўднасць. Этнічна гэта розныя нацыі, пры ўтварэнні якіх славянскі этнас выкарыстаны як элемент. Яны створаны з розных папярэдніх плямёнаў, якія ў Расіі ў сярэднім пераважаюць славянскі элемент. Такім чынам, расіян трэба лічыць у сярэднім малаславянскім народам. Папярэднія плямёны, з якіх з дапамогаю славянскага элементу стварыўся беларускі народ, іншыя, чым у Расіі і на Украіне. А карыстанне агульнай моваю і рэлігіяй не ператварае розныя этнасы ў адзін, бо гэта было б этнічным гвалтам, але акупанты заўсёды дзейнічаюць як гвалтаўнікі. Гвалтуемым народам крыўдна, калі скажаюць іх гісторыю, абражаюць іх продкаў і знішчаюць іх мову, але яшчэ горш, калі падштурхоўваюць да таго, каб яны ад роднай мовы самі адмовіліся. У гэтым праяўляецца вялікае "майстэрства" каланізатараў. З дапамогаю такога "майстэрства" створана сучасная Расія, але яшчэ паасобку ад яе знаходзіцца Беларусь, таму шавівіністы не могуць спаць спакойна.

Вы, спадар У.Вярнігораў, лічыце, што ў нас ніхто не супраць свабоды слова. Тады скажыце: чаму з вялікай цяжкасцю выходзяць незалежныя выданні, чаму многія з іх вымушаны друкавацца за мяжой? У той жа час толькі дзякуючы дэмакратычнай прэсе можна атрымаць аб'ектыўную інфармацыю. Скажыце, вось ваш адкрыты ліст спадару С.Навумчыку газета "Народная воля" надрукавала, а ці надрукавалі б артыкул С.Навумчыка газеты "Советская Белоруссия" або сённяшняя "Народная газета"? Не, не надрукавалі б. Ці даюць лідэрам апазіцыі выступіць па тэлебачанні? Не, не даюць, бо баяцца іх праўды і абараняюць народ ад яе, каб яна не перашкаджала і надалей яго абалваньваць. Грамадзяне Беларусі і незалежныя выданні карыстаюцца самай маленькай часткай ад сапраўднай свабоды слова, каб вы і іншыя змаглі сказаць, што гэтая свабода ў нас як быццам ёсць. Але яе хутчэй няма, чым яна ёсць. Адносіны дзяржавы да незалежных выданняў нагадваюць хутчэй адносіны ката да злоўленай ім, але яшчэ жывой мышы, якую ён, гуляючы, то адпусціць, то зноў схопіць, але ўцячы не дае. Каб канчаткова мыш з'есці, у ката ўсё неабходнае ёсць — і зубы, і вострыя кіпцюры, але пакуль што гэта зрабіць саромеецца суседзей, якія могуць сказаць, што кот — драпежнік, а ён не хоча, каб яго так называлі, бо аб сабе думае лепей, чым ён ёсць на самой справе. Свабода слова ў нас на Беларусі нагадвае "свабоду" вось такой недарэчнай і недадушанай мышы, а дзяржава — таго самага ката. Таму, спадар-таварыш У.Вярнігораў, не трэба ўводзіць людзей у зман.

Ваша параўнанне БНФ з бальшавікамі і "мнение", што ён фінансуецца з ЦРУ, лічу недарэчным. Хутчэй можна назваць БНФ не бальшавіцкай, а антыбальшавіцкай арганізацыяй і не фашысцкай, як некаторыя плявузгаюць, а антыфашысцкай. Бальшавізм і фашызм трэба шукаць у іншым месцы, сярод тых, каму ён падабаецца і хто іх хваліць або ўжывае такія метады. А таму, што ў палітычнай барацьбе трэба выкарыстоўваць адпаведныя, адэкватныя метады, каб не быць дурнем, я спадзяюся, вы пярэчыць не станеце. У адносінах да фінансавання з боку ЦРУ лічу, што гэтыя звесткі не адпавядаюць сапраўднасці, гэта хутчэй плёткі. Каб што тут рабілася з парушэннем законаў, то прэзідэнт даўно б забараніў, а вінаватых пасадзіў бы ў турму. Пакуль не садзіць, і гэта даказвае, што нічога незаконнага не робіцца.

Далей, вам не падабаецца, што Украіна "дистанцируется от России", але што тут кепскага, калі вялікая краіна, маючая, як і Беларусь, гістарычнае права на незалежнасць, імкнецца яе захаваць. Так дзейнічаюць і іншыя краіны (Чэхія і Славакія, Аўстрыя і Германія). А вам падабаецца вялікі імперскі бардак, каб ён захоўваўся вечна? Імперыі зараз маюць тэндэнцыю развальвацца. Было б добра, каб і Беларусь больш рашуча захоўвала сваю незалежнасць і прыняла б закон аб забароне агітацыі за далучэнне да іншай краіны, але ў адпаведнасці з Канстытуцыяй, нават 1996 года, Беларусь прызнаецца незалежнай дзяржавай. За гэтую Канстытуцыю народ прагаласаваў на рэферэндуме, таму незалежнасць Беларусі падтрымана беларускім народам, напэўна, і вамі таксама. А гэта значыць, народ ужо выказаўся супраць аб'яднання Беларусі з Расіяй у адну дзяржаву.

Аднак вас, напэўна, хвалюе пытанне аб правах грамадзян Беларусі расійскага паходжання, якія ў розныя часы прыехалі ў Беларусь з Расіі. Іх каля 20%, а беларусаў — 80%. Але ўсё можна зрабіць як трэба, калі выкарыстаць вопыт заходніх краін. Там, як гэта ні дзіўна, усе грамадзяне, нават эмігранты — патрыёты сваёй краіны і нацыяналісты ў добрым сэнсе. А ворагі Беларусі ператварылі гэтае слова ў ганебнае. У тых краінах дзейнічае закон аб грамадзянстве, у адпаведнасці з якім усе жыхары прызнаюцца паўнапраўнымі грамадзянамі краіны з роўнымі правамі, але яны павінны выконваць свой галоўны абавязак — быць патрыётамі і бараніць суверэнітэт краіны, нават прыехаўшыя. Але каб апошнія імкнуліся далучыць сваю новую краіну да той, адкуль яны прыехалі, такога не можа быць, бо іх пазбавяць у адпаведнасці з законам грамадзянства або аб'явяць акупантамі ці шпіёнамі. У тых краінах эмігранты, у тым ліку і расіяне, з задавальненнем вывучаюць мову сваёй новай Радзімы. Дзякуй Богу, гэтыя людзі не прывозяць з сабой у чужы манастыр свайго статута. І ўсё адбываецца як мае быць. Трэба, каб і на Беларусі так было. На Беларусі павінен дзейнічаць беларускі, а не расійскі прыярытэт, а ў Расіі — наадварот. Не мае сэнсу аб'яўляць БНФ ворагам і паклёпнічаць на яго, бо гэта самая патрыятычная арганізацыя на Беларусі, абаронца яе суверэнітэту і прыхільнік адраджэння беларускай нацыі, мовы і культуры, бо яны, дзякуючы дзейнасці царызму і бальшавікоў, прыйшлі ў заняпад. Таму не БНФ вораг Беларусі. Стратэгічныя мэты БНФ вельмі гуманныя, светлыя і прагрэсіўныя. Можа, яны перашкаджаюць тым, хто хоча дасягнуць іншых, чорных для беларускага народа мэтаў і падштурхоўвае яго да здрады самому сабе. Вялікі сорам і ганьба для тых людзей, якія гэтага дамагаюцца.

Таму зараз перад патрыятычным вызвольным рухам Беларусі стаіць галоўная задача — барацьба за наш беларускі народ. Няўжо ён, паверыўшы хлусам, пазбавіць сябе нацыі і Радзімы і ператворыцца ў нейкі інертны матэрыял для папаўнення нацыі іншай, суседняй краіны, сяброўства з якой такой вялікай цаной не павінна аплачвацца? Няўжо ён прадасць сваіх нацыянальных герояў, да якіх адносяцца і лідэры БНФ? Так, так, спадар У.Вярнігораў, не ўсміхайцеся, не вы герой, а яны. Не дай Бог, каб стварылася падобнае да таго, што ўжо было, калі распялі Хрыста, а падмануты фарысеямі просты народ запатрабаваў гэтага: "Понцій! Распні яго!". Не дай Бог, каб такі грэх паўтарыўся і падмануты беларускі народ запатрабаваў ад уладаў "распяць" БНФ. Вы ж яго тэарэтычна ўжо памкнуліся распяць.

Спадар У.Вярнігораў, тэрмін "славянскі шавінізм", які ўжыў С.Навумчык, вы не зразумелі і дарэмна параўналі яго з "бэнээфаўскім шавінізмам". Але такі шавінізм у прыродзе не існуе. Напэўна, вы пакрыўдзіліся на Навумчыка за тое, што да ліку прыхільнікаў славянскага шавінізму ён аднёс бы і вас, каб быў знаёмы з вамі. Не можа быць БНФ шавіністычным, бо мае іншыя мэты. А славянскія шавіністы — гэта тыя, хто імкнецца пазбавіць нас незалежнасці або дапамагае гэта зрабіць іншым. Гэта расійскія шавіністы і іх беларускія і ўкраінскія памагатыя названы агульным тэрмінам — славянскія шавіністы.

Ёсць яшчэ некалькі пытанняў, па якіх я з вамі не згодны. Але хопіць, надакучыла. Не крыўдуйце: ісціна даражэй за ўсё, нават непрыемная. Сумленны чалавек не павінен сябе і іншых падманваць, бо гэта — вялікі грэх.

Марат ГІРКА.

Мінск.

Чулі?

Хто ў судзе стане абаранячь Паўла Шарамета?

Міхаіла Воўчака пазбавілі ліцэнзіі на адвакацкую дзейнасць, Гары Паганяйлу выключылі з Мінскай гарадской калегіі адвакатаў, супраць Надзеі Дударавай узбуджана крымінальная справа... Чаму?

Чытачы "Народнай волі" ўжо ведаюць, што вядомы адвакат Гары Паганяйла вымушаны быў падаць заяву ў прэзідыум Мінскай гарадской калегіі адвакатаў аб сваім выхадзе з яе складу па асабістай просьбе. І "ўласнае жаданне" Гары Паганяйлы тут жа задаволілі.

Дасведчаныя людзі сцвярджаюць, што на такі ўчынак Гары Пятровіч пайшоў невыпадкова. Кемлівы і здагадлівы, прааналізаваўшы ход магчымых камбінацый, нібыта ў шахматнай партыі, Паганяйла прыйшоў да высновы: з ім могуць зрабіць тое ж самае, што і з адвакатам Міхаілам Воўчакам — прыпыніць дзейнасць адвакацкай ліцэнзіі. Такі загад ужо падпісаў міністр юстыцыі Генадзь Варанцоў.

Падставай "астудзіць" справядлівы абарончы пыл Воўчака з'явілася нібыта парушэнне ім адвакацкай этыкі. І не дзе-небудзь, а ў прэсе. Аказваецца, у артыкуле, змешчаным у газеце "Фемида-нова" пад назвай "Ці можа прэзідэнт памілаваць Шарамета?", здольныя юрысты з Мінюста знайшлі не зусім "адэкватныя справе" ацэнкі вінаватасці як карэспандэнта расійскага тэлеканала, так і "галоўнага героя" яго рэпартажаў. Асаблівы смутак у пільных чытачоў з Мінюста выклікалі, як яны палічылі, нетактоўныя выказванні ў адрас кіраўніка дзяржавы. Па іх прапанове міністр і даў магчымасць адвакату Воўчаку доўгі час паразважаць аб асаблівасцях сваёй прафесіі. І за гэтым вольным заняткам (без працы) можна будзе ў хуткім часе застаць не аднаго Міхаіла Валянцінавіча. У такой якасці "незалежнага і свабоднага мастака", як бачна, апынуцца зможа кожны. І таму ёсць іншыя прыклады...

Адвакат Надзея Дударава вымушана была склікаць прэс-канферэнцыю, каб зрабіць чарговую заяву ў дачыненні да тых перашкод, якія чыняць ёй судовыя ўлады ў правядзенні прафесійнай дзейнасці.

Як вядома, Надзея Барысаўна ўдзельнічае ў судовых працэсах, вядзе папярэднюю работу з падследнымі і абвінавачанымі і, зразумела, не толькі "па справе Шарамета". Але няцяжка здагадацца, што пэўныя сілы даўно ўжо шукаюць "зачэпкі", каб пазбавіць Дудараву ліцэнзіі на адвакацкую дзейнасць. Бо Надзея Барысаўна ні ў якія адвакацкія калегіі не ўваходзіць і дакумент на права абараняць людзей у судзе атрымала задоўга да іх стварэння. Цяпер жа, згодна з загадам міністра юстыцыі Рэспублікі Беларусь, ліцэнзіі могуць атрымаць толькі тыя, хто ўваходзіць у склад той ці іншай адвакацкай калегіі. Таму пазбавіць "незалежную" Дудараву гэтай шматпакутлівай сёння для ўсіх адвакатаў ліцэнзіі — усеагульная мара Мінюста. І "пробны" наезд на прынцыповага адваката Дудараву паспрабавала зрабіць суддзя Зоя Салаўёва, пад старшынствам якой у гарадскім судзе Оршы разглядалася "справа" Генадзя Райцына і яго "саўдзельнікаў".

Калі "падсудныя", паводле слоў Дударавай, заявілі аб тым, што іх збівалі ў пастарунку ў ходзе папярэдняга следства, дамагаючыся прызнання віны, Салаўёва раптам аб'явіла ў ходзе судовага следства перапынак і... дазволіла пракурору дапытаць падабаронных Дударавай, але без удзелу адваката. Тады Надзея Барысаўна ўслых заявіла аб грубым парушэнні судовага працэсу.

Па закону менавіта так: ніхто не мае права весці допыт абвінавачанага ні ў следчым ізалятары, ні ў судзе без удзелу адваката. Але суддзя Зоя Станіславаўна не прыслухалася да гэтай істотнай заўвагі вопытнага прафесіянала, і тады Надзея Барысаўна заявіла адводы такому суду і перш-наперш — яго старшыні. Аднак Салаўёва палічыла і ацаніла "непременную выходку" адваката як спробу ўздзейнічаць на суд, асабліва — на "народных заседателей". І па прапанове старшынствуючай суд тут жа прыняў пастанову аб узбуджэнні крымінальнай справы супраць... адваката Дударавай, спрабуючы інкрымінаваць ёй "умяшанне і ўздзеянне на дзейнасць суда", прадугледжанае артыкулам 172[2], частка першая, Крымінальнага кодэкса Рэспублікі Беларусь.

Аддадзім належнае і прафесійнаму ўзроўню Зоі Станіславаўны: з густам, калі верыць сказанаму на прэс-канферэнцыі, заварыла яна кашу супраць Надзеі Барысаўны. Пазбавіць Дудараву ліцэнзіі на адвакацкую дзейнасць зараз можна без усялякіх цяжкасцей. Тым больш, што ў падтрымцы зверху можна не сумнявацца. Бо, як паведаміла Надзея Барысаўна, Міністэрства юстыцыі Рэспублікі Беларусь склала спіс каля 200 адвакатаў, у які ўваходзіць і Дударава, дзе судам прапаноўваецца адхіляць разгляд спраў з іх удзелам. А карацей — не дапускаць "такіх" адвакатаў.

Яшчэ адзін факт для роздуму: у "Аршанскай справе" разам з Надзеяй Барысаўнай адстойвалі правы абвінавачваемых усяго тры адвакаты, якія, дарэчы, мелі аднолькавыя погляды на разгляд гэтай, у многім затуманенай, справы, а адхілілі ад удзелу ў ёй адну Дудараву, якой ужо самой "шыюць" крымінал.

У мяне, напрыклад, складваецца ўражанне, што ўсімі гэтымі спектаклямі, звязанымі з адвакатамі, кіруе чыясьці ўдалая рэжысёрская рука. І яшчэ больш хвалюе адно недарэчнае супадзенне: удзельнікамі драмы, як і героямі гісторый, чамусьці становяцца адвакаты, так ці інакш звязаныя са "справай Шарамета". Хто ж тады абароніць Паўла і яго калег са здымачнай групы на маючым адбыцца судзе? Праўда, Гары Паганяйла, кажуць, мае намер адстойваць правы Паўла Шарамета ў якасці грамадскага абаронцы.

Віктар СВІРКО.

Постскриптум

А у министра Геннадия Воронцова свое мнение

